УДК 947.6.«18/19»

У. М. Сцебурака, асістэнт

# ДЗЕЙНАСЦЬ РАСІЙСКІХ ВАЕННЫХ УЛАДАЎ НАПЯРЭДАДНІ І Ў ПЕРШЫЯ МЕСЯЦЫ ЛЮТАЎСКАЙ РЭВАЛЮЦЫІ 1917 Г. НА БЕЛАРУСІ

The article contains information about activity of Russian military structures in Belarus during the First world war before and after the February revolution of 1917. There are denoted spesific fiatures of this process. In this work we give special attension to the relations of military structures and local authorities in time when important changes have taken place in the country. We give some examples of the transformation process which took plase in the studing period. The article is devoted to the problems of formation and development of the democratic goverment during The First World War.

**Уводзіны.** Вывучаючы Лютаўскую рэвалюцыю 1917 г. у Расійскай імперыі, нельга пакідаць па-за ўвагай той кантэкст, у якім развіваліся падзеі, то бок кантэкст Першай Сусветнай вайны. Менавіта вайна распачала навейшы перыяд усеагульнай гісторыі і скаланула ўсё расійскае грамадства. 1 жніўня 1914 г. непасрэдна звязанае з Лютым і Кастрычнікам 1917 г. у Расіі, з лістападам 1918 г. у Германіі, з сакавіком 1919 г. у Венгрыі. Вайна 1914–1918 гг. як спецыфічны этап сусветнай гісторыі дала магутны імпульс выкарыстанню гвалтоўных метадаў вырашэння міждзяржаўных, нацыянальных і сацыяльных праблем на ўсё XX ст., таму без уліку вопыту і наступстваў вайны нельга зразумець тыя гістарычныя ўмовы, у якіх праходзіла дэмакратычная рэвалюцыя 1917 г. З пачаткам Першай сусветнай вайны адбыліся істотныя змены ў эканоміцы, палітычным жыцці, псіхалогіі насельніцтва. Пры гэтым армія па-ранейшаму аказвала ўплыў на палітыку і штодзенную рэчаіснасць, і яе роля ў бягучых працэсах заставалася вельмі значнай. Важным момантам бачыцца неабходнасць абвяржэння тэзіса пра «развал» войска і немагчымасць працягу выканання ім ранейшых функцый. Такім чынам, разгледзім у артыкуле некаторыя істотныя моманты ўзаемаадносін ваенных і цывільных улад пад час вайны як на агульнадзяржаўным узроўні, так і ў межах беларускіх губерняў Расійскай імперыі.

**Асноўная частка.** З набліжэннем лініі фронту да межаў Расіі беларускія губерні патрапілі ў сферу ўплыву ваеннага камандавання. На ваенным становішчы апынуліся землі, што былі ў раёне дзейнасці Заходняга фронту: Вілейскі, Дзісненскі, Свянцянскі, Ашмянскі паветы Віленскай губерні; Віцебскі, Веліжскі, Гарадоцкі, Лепельскі, Невельскі, Полацкі паветы Віцебскай губерні; усе паветы Мінскай і Магілёўскай губерняў [1, с. 36]. Пералічаныя тэрыторыі зазналі дзейнасць законаў ваеннага часу. Прыфрантавыя землі Расійскай імперыі не былі выключэннем. У першыя гады вайны ў большасці краін адбыліся істотныя змены: была згорнутая дзейнасць прадстаўнічых інстытутаў, уводзіліся жорсткія меры супраць апазіцыйнай прэсы і партый, ліквідаваліся правы прафсаюзаў і сацыяльныя заваёвы, часцей пачалі ўжывацца меры паліцэйска-рэпрэсіўнага характару, ствараліся ваенна-палявыя суды. Адначасова з істотным пашырэннем ролі выканаўчай улады паўсюдна вялікі ўплыў набылі кіруючыя ваенныя структуры – стаўкі, генеральныя штабы, камандуючыя франтамі, акругамі і буйнымі ваеннымі адзінкамі [2, с. 225].

На прыфрантавых тэрыторыях дзейнічалі законы ваеннага часу, гэта так званыя «Правілы аб мясцовасцях, што аб'яўленыя на ваенным становішчы» (існавалі ў выглядзе дадаткаў да Зводу законаў Расійскай імперыі) [3, с. 1], і, таксама, абавязковыя пастановы, што выдаваліся камандуючымі франтамі і вайсковымі акругамі. Менавіта яны дэкларавалі ў падрабязнасцях жыццё насельніцтва прыфрантавых паветаў і насілі характар забаронаў. Важна адзначыць, што нагляд за выкананнем, спагнанне штрафаў і налажэнне пакаранняў у выпадку парушэння пастаноў ускладалася на губернатараў (а пасля на губернскіх камісараў Часовага Ураду). Абавязковыя пастановы ўжо са жніўня 1914 г. пачалі абмяжоўваць розныя сферы жыцця: гандаль, набыццё пэўных матэрыялаў, перасоўванне грамадзян у межах паветаў і інш. [3, л. 5, 13, 28]. Асобнай функцыяй, якой былі надзеленыя ваенныя ўлады на тэатры баявых дзеянняў, была цэнзурная. З пачаткам Першай сусветнай вайны 20 ліпеня 1914 г. упершыню ў Расіі было афіцыйна зацверджана «Часовае палажэнне аб ваеннай цэнзуры» і створаны яе апарат. Па ім паштовая ваенная цэнзура ўводзілася ў поўным аб'еме «на тэатры баявых дзеянняў і часткова ў іншых раёнах краіны» [4, с. 160]. Менавіта яна, шырока распаўсюдзіўшы свае паўнамоцтвы, заставалася абсалютна незалежнай, бо, згодна закону, «ніякае ўрадавае месца, установа ці асоба ў імперыі не маглі патрабаваць ад ваенных ніякіх справаздач» [5, с. 47].

З усталяваннем фронту ў 1915 г. (на Беларусі па лініі Дзвінск-Баранавічы-Пінск) расійскае войска сутыкнулася з новымі складанасцямі, і абавязковыя пастановы, а значыць, і глыбіня пранікнення вайсковых інтарэсаў у жыццё цывільнага насельніцтва, сталі больш разнастайнымі

і ўзраслі колькасна. Восенню-зімой 1916 г. галоўны начальнік Дзвінскай ваеннай акругі (ДВА) рэгламентуе сваімі абавязковымі пастановамі рубку лесу, продаж і куплю некаторых тавараў і кошты на іх, забараняе вываз за межы акругі гужавога транспарту і інш. [1, л. 2, 7, 12]. У студзені 1917 г. дадаюцца пастановы аб забароне вывазу з ДВА газы і свечак, удакладняецца парадак прыцягнення жыхароў віцебскай губерні да перавозак грузаў і г. д. [1, л. 10, 14]. Асабліва акутальнымі напярэдадні Лютаўскай рэвалюцыі становяцца барацьба з дэзерцірствам і ўхіленнем ад вайсковай службы, процідзеянне ўцёкам ваеннапалонных, а таксама барацьба з абаротам спіртаўтрымліваючых вадкасцяў і самагонаварэннем.

Апошняе стала сапраўдным бедствам краю і клопатам улад усіх узроўняў. 22 жніўня 1914 г. Мікалай II падпісаў закон аб забароне продажу гарэлкі на час вайны. Пачаткова гэтая мера дала пэўны плён: увосень 1914 г. агульная колькасць злачынстваў скарацілася, так што міністр юстыцыі нават аддаў загад аб прыпыненні будаўніцтва новых турмаў; пажары ў сельскай мясцовасці зменшыліся на трэць; узраслі ўклады насельніцтва ў банкі; падвысілася вытворчасць працы [4, с. 154]. Але адначасова з'явіліся і складанасці: дзяржава страціла сур'езную крыніцу даходу (да сярэдзіны 1917 г. сухі закон пазбавіў скарбніцу 2,5 млрд. руб., што складала 10% ад расходаў на ваенныя патрэбы), а насельніцтва пачало нелегальную вытворчасць гарэлкі. Пра маштабы сведчаць лічбы, сабраныя даследчыкам А. Мак-Кі: у 1913 г. паліцыя мела звесткі ўсяго пра 600 выпадкаў самагонаварэння, у 1915 г. – аб 6000, а толькі за верасень 1916 – май 1917 г. – аб 9351 выпадку [4, с. 155]. Пры гэтым у крыніцах паведамляецца, што лічбы ў гэтых справаздачах трэба памнажаць на 10, каб уявіць сапраўдны маштаб з'явы. Неаспрэчнымі ж цэнтрамі самагонаварэння названыя Беларусь, Урал і Сібір.

На пярэднім краі барацьбы з усімі парушэннямі была паліцыя. Часта і жандармерыі прыходзілася, адхіляючыся ад сваіх непасрэдных абавязкаў, займацца пошукам дэзерціраў і самагоншчыкаў [6, л. 1]. Каардынацыяй дзейнняў з жандармерыяй кіравалі аддзелы контрразведкі, што меліся пры кожным штабе акругі і займаліся барацьбой са шпіянажам і негалосным наглядам за афіцэрамі [5, л. 9]. Па запытах ваеннай контрразведкі жандарскія філёры праводзілі назіранні за падазронымі асобамі ў тылавой зоне і падтрымлівалі сталую сувязь з камандаваннем, аб чым сведчаць справаздачы палкоўніка віцебскага жандарскага ўпраўлення Шульца [6, л. 23, 25].

Рэвалюцыя паспрыяла ўскладненню сітуацыі ў арміі. Акрамя складанасцяў, звязаных са станам спраў на фронце, меліся і ўнутраныя супярэчнасці. Па словах А. І. Дзянікіна, сама Стаўка наогул не карысталася сімпатыяй, бо была нібы аддзеленая ад войска і жыла сваім жыццём з грувасткім апаратам, блытанінай функцый і неакрэсленасцю адказнасці. З пачаткам рэвалюцыі Стаўка насуперак палажэнням ваеннай навукі стала органам, падначаленым ваеннаму міністэрству, што хоць і не вынікала з прававых актаў, але было рэальнасцю праз змяшэнне функцый і той уплыў, які меў больш моцны па характары ваенны міністр Гучкоў на мяккага генерала Аляксеева [5, л. 85–87].

1 сакавіка 1917 г. выйшаў Загад № 1 Петраградскага Савета, згодна з якім у войску стварыліся выбарныя салдацкія камітэты. Часовы ўрад, у сваю чаргу, выдаў дэкларацыю, якая адмяняла саслоўныя, рэлігійныя, нацыянальныя абмежаванні, надзяляла салдатаў грамадзянскімі правамі. Гэтыя новаўвядзенні паклалі пачатак развалу расійскага войска. «Уся ваенная іерархія скаланулася да падмурку, войска толькі знешне захоўвала атрыбуты ўлады і парадак. Выходзілі дырэктывы, якія не маглі зрушыць войскі з месца, загады, якія не выконваліся, суды выносілі прысуды, над якімі смяяліся»; «Усё было санкцыянавана загадам № 1 Петрасавета. У першы месяц рэвалюцыі ўрад і ваеннае начальства не прымалі ніякіх мер ні па ліквідацыі, ні па ўвядзенні ў пэўныя рамкі гэтага рашэння», – узгадвае Дзянікін [5, с. 96, 215]. Да такіх ацэнак далучаецца і адзін з найбольш вядомых военачальнікаў Германіі генерал Гіндэнбург: «У сакавіку (1917 г. – аўт.) рэвалюцыя, якую падтрымала Антанта, скінула цара. Рэвалюцыя рэзка высвятліла стан Расіі: народ і войска прагнілі, у адваротным выпадку рэвалюцыя была б немагчымай» [7, с. 411]. Ваеннае міністэрства нібы пакінула войска на волю лёсу. Міністр Гучкоў нават 9 красавіка 1917 г. на выступленні перад войскамі ў Ясах казаў рэчы, якія не дадавалі яснасці: «Хутка будзе скліканы з'езд дэлегатаў усіх армій і на ім будзе выпрацаваны ўстаў. Пакуль жа арганізуйцеся як умееце, карыстайцеся існуючымі арганізацыямі і працуйце над агульным з'яднаннем» [5, с. 215].

Нягледзячы на гэта вайсковыя ўлады працягвалі ўздзейнічаць на свой тыл. Ва ўмовах харчовага крызісу войска ўсё больш клапацілася пра забеспячэнне сваіх патрэб у хлебе і фуражы. У маі 1917 г. галоўнакамандуючы Заходнім фронтам генерал ад кавалерыі Гурко выдае загад па дзеючых арміях, у якім абавязвае прыняць меры па ахове лугоў, палёў і інш., і тлумачыць гэта тым, што захаванне ўраджаю – справа ўсенародная. У загадзе звяртаецца ўвага, што шматлікія часткі «карыстаюцца падножным кормам» (папросту жывяцца рабаўніцтвам) і пры гэтым «травяць і топчуць» сялянскія і памешчыцкія ўгоддзі. Нагляд за выкананнем загаду галоўнакамандуючы ўскладае на камітэты [1, л. 36].

Услед за Часовым урадам ваенныя звярталіся да насельніцтва з заклікамі. Так, 5 сакавіка 1917 г. галоўны начальнік ДВА генерал ад інфантэрыі Зуеў звяртаецца з адозвай да «Грамадзян акругі», у якой абвяшчае аб пераходзе да Новага ладу, аб прызнанні гэтага ладу Галоўна-камандуючым і афіцэрамі Расійскай арміі і заклікае грамадзян захоўваць найперш парадак. У звароце таксама абвяшчаецца еднасць войска з народам. Больш таго, Зуеў не толькі дэкларуе ўсебаковую падтрымку насельніцтву ў стварэнні новых стуктур – харчовых камітэтаў і міліцыі, беручы на сябе нават адказнасць за абяззбройванне старой паліцыі, але і абяцае самым рашучым чынам прыпыняць рабаўніцтвы і бязладдзе [1, л. 26]. Пры гэтым у пастановах ваенных улад можна заўважыць прыкметы лібералізацыі, агульныя для ўсёй краіны ў той час. Так, 7 сакавіка 1917 г. чарговай абавязковай пастановай галоўны начальнік ДВА адмяняе ранейшыя абмежаванні, што датычыліся неасцярожнага аглашэння ці публічнага распаўсюджвання звестак пра дзейнасць кіраўнічых органаў і дзяржаўных асобаў [1, л. 27]. Відавочна, што абвешчаныя свабоды вымагалі і пэўнага ўзроўню галоснасці, асабліва ва ўмовах пабудовы новай сістэмы ўлады ў краіне, таму і далей многія абавязковыя пастановы адмянялі забароны, зробленыя пад час вайны: скасоўвалася забарона пакідаць працоўныя месцы на фабрыках і заводах і інш. [1, л. 34].

Яскрава ўплыў ваенных улад на цывільныя прасочваецца ў сакавіку 1917 г. на прыкладзе пастаноў і загадаў Заходняга фронту ў тыл. 5 сакавіка 1917 г. за подпісам Галоўнага начальніка забеспячэння Заходняга фронту князя Туманава выходзіць загад (для губернатараў мінскага, магілёўскага, віцебскага і інш.) вызваліць з-пад арышту ўсіх палітычных зняволеных, за выключэннем асобаў, што падазраюцца ў дзяржаўнай здрадзе [8, л. 4]. 6 сакавіка 1917 г. Туманаў паведамляе тым жа губернатарам, што ў Мінску зацверджаная пасада грамадзянскага каменданта горада ў асобе старшыні губернскай земскай управы; паліцыя замененая грамадзянскай міліцыяй; створаны часовы гарадскі камітэт з выканаўчай часткай для заведвання справамі паліцыі (міліцыі). У тэлеграме ад імя Галоўнакамандуючага Заходнім фронтам прапануецца даць заключэнне на конт магчымасці ўвядзення падобных устаноў у гарадах і паветах азначаных губерняў [8, л. 14]. У адказ віцебскі губернскі камісар Карташоў паведамляе, што згодна атрыманым распараджэнням Часовага ўрада ён прымае кіраванне і пачынае займацца арганізацыяй улады ў губерні [8, л. 15].

9 сакавіка 1917 г. Галоўнакамандуючы Паўночным фронтам аддаў на імя віцебскага камісара загад па губерні падцвердзіць усім чынам «безумоўнае падпарадкаванне і поўную аддасць і вернасць» новаму ладу для бездакорнага выкананння загадаў ад Часовага ўрада [8, л. 29].

З гэтых паведамленняў можна зрабіць выснову, што камандаванне арміі было зацікаўлена не столькі ў падрабязнасцях пабудовы новага апарату кіравання ў тыле, колькі ў захаванні парадку і бесперапыннай працы структур, што непасрэдна забяспечвалі баяздольнасць войска. Клопат пра тыл не быў залішнім, бо менавіта адтуль фронт бачыў сабе пагрозу нават большую, чым ад ворага на пярэднім краі. Вось як генерал Дзянікін апісвае падзеі пасля лютага 1917 г.: «Грамадзянскае кіраванне прыфрантавога раёна часткова "правам захопу" камітэтаў, часткова санкцыяй дзяржавы выходзіла з рук ваеннага кіраўніцтва. Усе правы ваенных начальнікаў засталіся неадмененымі, але на практыцы паступова перасталі выконвацца. Гэтыя абставіны канчаткова падарвалі аўтарытэт Стаўкі ў вачах армій, а сярод вышэйшага камандавання выклікалі імкненне да непасрэднага сбліжэння з уладнымі структурамі, абмінаючы Стаўку» [5, с. 93]. Ваенныя начальнікі розных узроўняў не толькі супрацоўнічалі з грамадзянскімі ўладамі, але нярэдка і канфліктавалі, асабліва з-за нявызначанасці функцый і кампетэнцыі. Да прыкладу, 8 сакавіка былы іспраўнік Гарадоцкага павета Віцебскай губерні Скамарохаў скардзіцца ў Вітгубкам, што прыстаў 2-га стана Траснікоў і чацвёра стражнікаў у Езерышчы арыштаваныя патрулямі Невельскага гарнізона і адпраўленыя ў Невель [8, л. 41]; 9 сакавіка Невельскі павятовы камісар Гайжэўскі паведамляе пра арышт начальнікам гарадскога гарнізона ўсёй паліцыі на чале з Церпілоўскім [8, л. 42]. У выніку губернскі камісар Карташоў вымушаны быў звяртацца да Галоўнага начальніка ДВА з просьбай вызваліць арыштаваных па прычыне адсутнасці ў начальнікаў гарнізонаў належных для затрымання паўнамоцтваў [8, л. 43]. 10 сакавіка ў Вітгубкам прыходзіць паведамленне ад павятовага камісара Люцынскага павета Крюдзенера-Струве аб прыбыцці з Рэжыцы вайсковай часткі на чале з падпалкоўнікам і самавольным вызваленні ім 68 крымінальных злачынцаў, аб разрабаванні цэйхгаўза і знішчэнні спраў канцыляры [8, л. 105]. Гэтыя прыклады даюць уяўленне пра тую ролю, якую выконвала ўзброеная сіла ў падзеях лютага – сакавіка 1917 г.

Асаблівую ўвагу праяўляла армейскае кіраўніцтва да роспуску паліцыі і фарміравання новай грамадзянскай міліцыі. Гэта тлумачыцца зразумелай зацікаўленнасцю ў падтрыманні парадку ў тыле дзеючых частак. Клапаціцца было пра што: з розных месцаў імперыі ішлі паведамленні пра сотні і тысячы арыштантаў, вызваленых у першыя дні Лютаўскай рэвалюцыі. Толькі з турмаў Петрагарада, па паведамленні начальніка контрразведкі Петрагарадскай ваеннай акругі Нікіціна, выйшла каля 10 тыс.

крымінальных злачынцаў [9, л. 4]. На Беларусі вызваляліся арыштанты, абяззбройвалася паліцыя, разбіралася зброя, і такі стан рэчаў патрабаваў рашучых дзеянняў [10, л. 21, 23, 31]. Ці не галоўную ролю ў парушэннях парадку адыгрывалі самі вайскоўцы.

Нельга абвінавачваць войска ва ўсіх праблемах, што мелі месца ў сістэме кіравання. Грамадзянскія органы ўлады таксама не адрозніваліся паслядоўнасцю і аператыўнасцю ў сваіх дзеяннях. Напрыклад, калі 16 сакавіка штаб ДВА запытаў Віцебскі губернскі камітэт аб перадачы павятовым камісарам губерні функцый ваенных цэнзараў друку, і з гэтай прычыны папрасіў іх асабістыя звесткі, то нават 25 красавіка 1917 г. звесткі гэтыя не былі пададзеныя [8, с. 380–381]. Працягвалі вайскоўцы сачыць і за тылавым друкам і адкрыта ўмешвалася ў яго справы. Так, у маі 1917 г. штаб 10-й Арміі загадвае мінскаму губернскаму камісару разабрацца з друкарняй «Новая заря», якая надрукавала ў закліку пайменны складу 81 пяхотнай дывізіі [11, л. 9]. Падобныя гэтаму здарэнні падкрэсліваюць стан рэчаў, што стаў звычайным у азначаны час.

**Заключэнне.** З узгаданага вышэй у агульных рысах вынікае вялікі аб'ём і амаль неабмежаваны абсяг клопатаў дзеючага войска па арганізацыі і рэгламентацыі жыцця ў зоне яго кампетэнцыі. Да гэтага неабходна дадаць, што само расійскае войска напярэдадні Рэвалюцыі ў лютым 1917 г. знаходзілася далёка не ў ідэальным стане, але нельга забываць, што ў цэлым яно заставалася дастаткова баяздольным, прынамсі для таго, каб да сярэдзіны студзеня 1917 г. утрымліваць на сваім фронце 187 варожых дывізій, што складала 49% усіх аўстра-германскіх сіл [5, с. 33].

Адзначым, што ў падзеях Лютаўскай рэвалюцыі актыўную ролю прымала расійскае войска ва ўсёй сваёй масе – ад генералітэту да салдатаў. Ва ўмовах крызісу яно заставалася ўсё ж пэўным фактарам стабільнасці і ад яго паводзін шмат у чым залежала сітуацыя ў краіне ў цэлым і ў прыфрантавой зоне ў прыватнасці. Ваенныя ўлады, нягледзячы на сур'ёзныя складанасці з забеспячэннем харчам, фуражом і амуніцыяй, а таксама на падзенне ўзроўню дысцыпліны і кантролю над салдатамі, прыкладалі ўсе намаганні, каб трымаць пад кантролем падуладную ім прыфрантавую зону, абапіраючыся на новыя структуры Часовага ўрада. Прыведзеныя прыклады загадаў ваеннага камандавання дазваляюць зрабіць выснову, што на пераходным этапе (у першыя тыдні пасля перамогі Лютаўскай рэвалюцыі) армія, ў асобе яе вышэйшага камандвання, стала пасярэднікам паміж цэнтральнай уладай у сталіцы краіны і мясцовым апаратам, які напачатку быў неуніфікаваным і не меў дакладна акрэсленай кампетэнцыі. Сама армія зімой – вясной 1917 г. у складаных умовах эканамічнага крызісу і палітычнай няпэўнасці усё ж была яшчэ здольнай выконваць і прамыя абарончыя функцыі і забяспечваць каардынацыю дзеянняў з грамадзянскімі ўладамі прыфрантавых губерняў.

## Літаратура


1. Национальный архив Республики Беларусь (НАРБ). – Фонд 622. – Оп. 1. – Д. 7. Обязательные постановления Министерства торговли и промышленности Временного правительства и главнокомандующих армиями Западного и Северного фронтов.
2. Первая мировая война. Пролог XX века / Мальков А. Л. [и др.]; отв. ред. А. Л. Мальков. – М: Наука, 1999 г. – 698 с.
3. НАРБ. – Фонд 622. – Оп. 1. – Д. 5. Обязательные постановления главного начальника Двинского военного округа и приказы главнокомандующего армиями Северного и Западного фронтов.
4. Россия и Первая мировая война: материалы международного научного коллоквиума. – СПб: Дмитрий Буланин, 1999. – 678 с.
5. Деникин, А. И. Очерки русской смуты. Крушение власти и армии: февраль – сентябрь 1917 г. / А. И. Деникин. – Минск: Харвест, 2003. – 463 с.
6. Государственный архив Российской Федерации (ГАРФ). – Фонд 1. – ДП 00 5. – Ч. 12. Дело департамента полиции; наружное наблюдение. Социал-демократы по Витебской губернии.
7. Людендорф, Э. Мои воспоминанаия о войне. 1914 – 1918 гг / Э. Людендорф. – Минск: Харвест, 2005. – 800 с.
8. НАРБ. – Фонд 622. – Оп. 1. – Д. 1. Журнал заседаний Витебского губернского правления; переписка Витебского губернского комиссара с уездными комиссарами.
9. Никитин, Б. Роковые годы. Новые воспоминания участника (мемуары начальника военной контрразведки Петроградского военного округа) / Б. Никитин. – М: Правовое просвещение, 2000. – 256 с.
10. НАРБ. – Фонд 622. – Оп. 1. – Д. 29. Рапорты полицейских и уездных исправников.
11. НАРБ. – Фонд. 617. – Воп. 3. – Спр. 4. Канцылярыя Мінскага губернскага камісара.